К@нтыненты

НА РАДЗІМЕ ШЭНГЕНА

ЯК ГЕРЦАГСТВА ЛЮКСЕМБУРГ «ДАЛО ФОРЫ» ЎСІМ?

Днямі Еўрапейскае статыстычнае агенцтва (Eurostat) апублікавала звесткі аб фактычным індывідуальным спажыванні на душу насельніцтва (Actual Individual Consumption per capita) і пра долю ВУП у разліку на душу насельніцтва (GDP per capita) у краінах ЕС. Сярэдні ўзровень па 28 краінах ЕС бярэцца за 100 працэнтаў. Германія заняла другое месца (плюс 22 працэнтныя пункты да разліковага паказчыка). У Аўстрыі, Даніі і Вялікабрытаніі, Бельгіі, Фінляндыі, Нідэрландах, Швецыі і Францыі вынік перасягае сярэдні па ЕС на 10—20 працэнтаў. Самы нізкі ўзровень спажывання на душу насельніцтва сярод краін ЕС адзначаны ў Балгарыі (54 працэнты), Венгрыі (62 працэнты), Харватыі (62 працэнты), Румыніі (68 працэнтаў) і Латвіі (68 працэнтаў). А бясспрэчнае першае месца па індывідуальным спажыванні на душу насельніцтва ў Еўрасаюзе заняў Люксембург, дзе ўзровень амаль на трэць вышэйшы. Прычым герцагства лідзіруе па гэтым паказчыку на працягу апошніх чатырох гадоў. За кошт чаго невялічкі Люксембург «даў форы» ўсім?

МАЛЕНЬКАЯ КРЭПАСЦЬ

У далёкім мінулым галы, франкі і рымляне напераменку захоплівалі гэтую тэрыторыю, пакуль у 963 годзе маленькі ўмацаваны замак Лісілінбург (Lucilinburg — «маленькая крэпасць») не атрымаў статус незалежнага. Першым графам у 1060-м стаў Конрад, а герцагствам Люксембург абвясцілі толькі праз тры стагоддзі — у 1354-м. Пасля краіна то адыходзіла Аўстрыі, то яе захоплівала Францыя, а потым перадавала Іспаніі. «Вялікім» герцагствам Люксембург стаў у 1815 годзе, а ў верасні 1867-га атрымаў статус «вечна нейтральнага».

З уступленнем у 1949 годзе ў НАТА гэты нейтралітэт быў парушаны. Дарэчы, Люксембург — адна з нямногіх малых краін, у якой ёсць уласныя ўзброеныя сілы. Дарэчы, яны нават прымалі ўдзел у афганскай аперацыі НАТА «Рашучая падтрымка» ў колькасці аднаго (!) салдата. Пазней кантынгент быў павялічаны да... двух байцоў.

Вядома ж, па памерах і дапамога (цяпер плошча Люксембурга, які мяжуе з Бельгіяй, Германіяй і Францыяй, — каля 2,5 тысячы кв. км). Насельніцтва краіны складае ўсяго каля 600 тысяч чалавек. Пры гэтым 40 працэнтаў — гэта эмігранты, у асноўным з Партугаліі, Францыі і Італіі. У самой сталіцы, горадзе Люксембургу, пражывае ўсяго 180 тысяч чалавек, але ў будныя дні колькасць павялічваецца амаль удвая — з-за жыхароў суседніх краін, якія штодня прыязджаюць сюды на працу.

Стаўленне да мігрантаў у герцагстве асаблівае, што, дарэчы, падкрэслівае выпадак, які адбыўся на мінулым тыдні. Міністр замежных спраў Люксембурга Жан Асельборн сарваўся на лаянку, слухаючы выступленне кіраўніка МУС Італіі Матэа Сальвіні на канферэнцыі ў Аўстрыі, прысвечанай пытанням міграцыі. На адной з закрытых для прэсы нарад адбыўся інцыдэнт з удзелам італьянскага міністра і Асельборна, які таксама курыруе пытанні міграцыі і прыстанішча. Відэазапіс сваркі трапіў у інтэрнэт, яе, у прыватнасці, выклаў у сваім акаўнце ў «Твітэры» сам Сальвіні. Па паведамленні люксембургскага выдання Paperjam, італьянскі чыноўнік, выступаючы перад сваімі еўрапейскімі калегамі, заявіў, што яго краіне мігранты не патрэбныя. «Магчыма, такая патрэба ёсць у Люксембургу», — сказаў Матэа Сальвіні. Слухаючы выступленне італьянскага калегі, кіраўнік люксембургскага МЗС не вытрымаў, сарваў з сябе навушнікі і паспрабаваў перабіць Сальвіні. «У Люксембургу былі дзясяткі тысяч італьянцаў, якія прыехалі як мігранты, працавалі ў Люксембургу, каб у вас у Італіі былі сродкі для дзяцей. Ды чорт вазьмі!» — ускіпеў Асельборн на французскай, выкарыстаўшы пры гэтым моцнае слоўца. У распаўсюджанай па выніках перагавораў заяве кіраўніка МЗС Люксембурга адзначаецца, у прыватнасці, што «Еўропа мае патрэбу ў легальнай міграцыі перад фактам старэння свайго насельніцтва».

СПРАВА ДЛЯ ВЯЛІКАГА ГЕРЦАГА

У краіне выкарыстоўваецца тры афіцыйныя мовы: нямецкая, французская, а таксама, з 1984 года, люксембургская. Таксама многія гавораць на англійскай, таму кожны жыхар — дакладна стапрацэнтны паліглот. Менавіта недалёка ад люксембургскай вёсачкі Шэнген у чэрвені 1985 года на левым прытоку Рэйна (рака Мозель), на мяжы трох дзяржаў, прадстаўнікамі асноўных еўрапейскіх краін (Германія, Францыя, Бельгія, Нідэрланды, Люксембург) было падпісана гістарычнае Шэнгенскае пагадненне, якое адмяняла пагранічны кантроль. Праўда, у сілу яно ўступіла толькі праз 10 гадоў, у 1995-м, а да вышэйназваных краін далучыліся Іспанія і Партугалія.

Кіраўнік Люксембурга — Вялікі герцаг. Паводле канстытуцыі, ён вызначае парадак арганізацыі ўрада і яго склад, зацвярджае і апублікоўвае законы, прызначае чыноўнікаў на грамадзянскія і ваенныя пасады, камандуе ўзброенымі сіламі, заключае міжнародныя дагаворы. У 1964 годзе на трон Люксембурга ўзышоў прынц Жан. У кастрычніку 2000 года Жан адрокся ад трона, спаслаўшыся на ўзрост, і Вялікім герцагам стаў яго сын Анры. Фактычна ж уся выканаўчая ўлада належыць ураду. Кіраванне ў акругах ажыццяўляецца камісарамі, у кантонах — бургамістрамі. Органамі самакіравання ў камунах з'яўляюцца выбарныя саветы.

«МОЗЕЛЬСКАЕ» І БЯСПЛАТНЫ ТРАМВАЙ

Зараз маленькая краіна выплачвае самую вялікую мінімальную заработную плату ў свеце. Праўда, пры гэтым Люксембург мае вялікі знешні доўг, вельмі моцна залежыць ад міжнародных партнёраў, таму сусветныя крызісы вельмі цяжка адбіваюцца на эканоміцы. Тут ёсць буйное радовішча жалезнай руды (адносіцца да шырокага Латарынгскага басейна — каля паўднёвай мяжы краіны). Як адзначыў дырэктар па міжнародных сувязях Гандлёвай палаты Люксембурга Жано Эрпелдынг, у краіне моцная прамысловасць. Аддаецца значная ўвага стварэнню тэлекамунікацыйных сетак і вытворчасці аўдыя- і відэатэхнікі. Выпускаюцца хімічныя прадукты, машыны, пластмасы, тканіны, шкло, фарфор. Шмат новых прадпрыемстваў было створана буйнымі фірмамі ЗША. Для замежных кампаній вельмі прывабным фактарам з'яўляецца тое, што мясцовыя рабочыя ведаюць некалькі моў. Пры высокім індустрыяльным развіцці ў краіне працягваюць займацца традыцыйнымі галінамі сельскай гаспадаркі — мяса-малочнай жывёлагадоўляй, садоўніцтвам, вінаградарствам. Асабліва славяцца вінаграднікі ўздоўж ракі Мозель. У гэтай даліне вырошчваюць адборныя сарты вінаграду, з якіх вырабляюць сусветна вядомыя віны «Рыслінг», «Мозельскае», «Рыванер».

З наступнага лета, згодна з рашэннем урада Люксембурга на чале з Ксаўе Бетэлем, па ўсёй краіне будзе адменена плата за паездкі на ўсіх відах транспарту, уключаючы трамваі, аўтобусы і прыгарадныя цягнікі. Пасля ўступлення ў сілу новага закона герцагства стане першай у свеце дзяржавай з бясплатным грамадскім транспартам.

Як паведамляе брытанскае выданне The Guardian, адпаведнае рашэнне было прынята з-за аўтамабільных заторaў, якія штодня збіраюцца па ўсёй краіне. Каб разгрузіць дарогі ад машын, улады і вырашылі адмяніць плату за праезд на грамадскім транспарце, зрабіўшы яго больш папулярным сярод насельніцтва. У далейшым таксама плануецца зрабіць бясплатным праезд у першым і другім класах цягнікоў. Дарэчы, зараз у герцагстве бясплатны праезд на грамадскім транспарце дазволены дзецям, а таксама маладым людзям да 20 гадоў. Астатнія грамадзяне могуць купіць білет усяго за два еўра на дзве гадзіны — гэтага часу хопіць, каб перасекчы ўсю краіну.

МЕТАЛЫ НА АСТЭРОІДАХ

Тым не менш каля 90 працэнтаў экспарту — гэта паслугі: фінансавыя, юрыдычныя. Краіна — важны міжнародны фінансавы і лагістычны цэнтр. Дзякуючы выгадным умовам у сталіцы герцагства размешчаны каля тысячы інвестыцыйных фондаў і больш за 200 банкаў — больш, чым у любым іншым горадзе свету. Добра развіты такі напрамак, як навуковыя даследаванні і інавацыі. Як паведаміў кіраўнік дэпартамента знешніх сувязяў Агенцтва па інавацыях Люксембурга «Люксінавэйшн» Ян Крэсвел, у краіне працуюць 23 цэнтры апрацоўкі даных. Ва ўніверсітэце, адкрытым у 2003 годзе, працуюць навукоўцы з 20 краін і навучаюцца студэнты са 115 краін. Герцагства займае 15-е месца ў сусветным рэйтынгу па глабальным індэксе інавацыйнасці.

Люксембург стварае касмічнае агенцтва і фонд у памеры 100 мільёнаў еўра для інвеставання ў стартапы, якія распрацоўваюць касмічныя тэхналогіі. Пра гэта паведаміў намеснік прэм'ер-міністра краіны Эцьен Шнайдэр газеце Financial Times. У адрозненне ад НАСА, Люксембургскае касмічнае агенцтва, як заўважыў Шнайдэр, не збіраецца запускаць ракеты, а сканцэнтруецца на «развіцці бізнес-прадпрыемстваў у космасе». «Мы хочам стаць краінай, якая асвойвае космас», і зацікаўлены ў супрацоўніцтве з іншымі дзяржавамі, адзначыў віцэ-прэм'ер. На яго думку, ЕС не павінен «пакідаць гэты рынак амерыканцам».

У жніўні мінулага года Люксембург, як нагадвае Financial Times, стаў першай краінай Еўропы, якая афіцыйна дазволіла кампаніям і камерцыйным групам, якія базіруюцца ў Вялікім герцагстве, удзельнічаць «у асваенні касмічных рэсурсаў». Перагаворы з зацікаўленымі партнёрамі стварылі прававую аснову для арганізацый, якія маюць намер здабываць такія карысныя выкапні, і валодаць імі, удакладніў Шнайдэр. У сувязі з падобнай ініцыятывай больш за 150 кампаній, інстытутаў, якія займаюцца касмічнымі даследаваннямі, звярнуліся апошнім часам да люксембургскіх улад па дазвол уладкавацца ў краіне.

Раней Люксембург распрацаваў планы здабычы рэдкіх мінералаў і металаў на астэроідах (Space Resources initiative) сумесна з партнёрамі з ЗША і Еўрасаюза. Партнёрамі Вялікага герцагства сталі ў тым ліку амерыканскія кампаніі «Deep Space Industries» і «Planetary Resources of the US». Гаворка ідзе пра стварэнне касмічнай галіны з мэтай пошуку і здабычы матэрыялаў, якія рэдкія на Зямлі, але ёсць у дастатковай колькасці на астэроідах. Па словах спецыялістаў, яны знаходзяцца значна далей за Месяц, але бліжэй, чым Марс, таму цалкам у межах дасяжнасці касмічных беспілотных лятальных апаратаў. Паводле ацэнкі экспертаў, першапачатковы кошт стварэння падобнай касмічнай галіны складзе дзясяткі мільярдаў, а патэнцыйны аб'ём рынку — трыльёны долараў. Так што перспектывы ў Люксембурга, нават мяркуючы па гэтым глабальным «стартапе», неабсяжныя.

Захар БУРАК.

Навігатар

СВЯТКУЕМ УСІМ СВЕТАМ!

Незвычайныя святы і традыцыі на Каляды і Новы год

Усе мы з нецярпеннем чакаем святочных мерапрыемстваў у канцы года. Акрамя добра вядомых урачыстасцяў, у розных краінах ёсць свае асаблівыя святы, якія адлюстроўваюць нацыянальны дух. Прапануем вам акунуцца ў незвычайную атмасферу найбольш цікавых з іх.

Казліная традыцыя

«Калядны казёл» (Julbok) — чыста шведскі сімвал сустрэчы самага чароўнага зімовага свята. Казёл, вядома, не сапраўдны, звычайна яго майструюць з саломы. «Казліная традыцыя» расце сваімі нагамі (ці рагамі?) са скандынаўскай міфалогіі, аднак шведы ўдала адаптавалі яе да сучасных хрысціянскіх традыцый.

У 1966 годзе ў горадзе Еўле ўпершыню ўсталявалі гіганцкую скульптуру каляднага казла. З тых часоў штогод праціўнікі гэтай традыцыі спрабуюць нанесці святочнай жывёле шкоду або наогул выкрасці яе. Прынамсі, 28 з 45 казлоў, якія былі ўзведзены на Каляды ў Еўле, падвяргаліся таму ці іншаму акту вандалізму. Як сцвярджае аўтар шведскай газеты The Local, прыкладна палова жыхароў горада ганарыцца сваім калядным казлом, а іншая палова яго ненавідзіць і марыць «спаліць ідалішча паганае».

З жыцця радысак

Незвычайнае свята «Ноч радысак» адзначаюць 23 снежня ў Мексіцы. Радыска была завезена туды ў сярэдзіне пазамінулага стагоддзя іспанскімі каланістамі і выдатна прыжылася. У Мексіцы яна вырастае да памераў бульбіны, а камяністая глеба прымушае яе прымаць незвычайную скрыўленую форму. Дзякуючы такому арыгінальнаму вонкаваму выгляду караняплода мексіканцы забаўляюцца тым, што складаюць з радысак біблейскія сцэнкі і эпізоды з ацтэкскіх легендаў. На цэнтральнай плошчы Аахакі праходзіць незвычайная выстаўка твораў мясцовых аграрыяў. Найлепшыя работы ўзнагароджваюцца прызамі, а вечар заканчваецца танцамі пад акампанемент мар'ячы і ўзрушальным феерверкам.

Час каціць бочкі

У Шатландыі існуе свята агню «Хагмані». Пачынаецца яно вечарам 31 снежня і заканчваецца раніцай 1 студзеня. У гэтую ноч людзі выходзяць на вуліцы, падпальваюць бочкі з дзёгцем і катаюць іх па маставых, такім чынам праганяючы стары год і зазываючы новы. Пры гэтым усе спяваюць народныя песенькі і чытаюць вершы самага вядомага шатландскага паэта — Роберта Бёрнса. Як толькі прагучыць звон, які паведамляе пра надыход Новага года, уступае ў сілу павер'е аб тым, што першы чалавек, які ўвайшоў у дом, з'яўляецца прадвеснікам шчасця і дабрабыту прымаючай сям'і. Самым лепшым варыянтам чамусьці лічыцца цёмнавалосы мужчына з традыцыйнымі падарункамі.

Бі посуд і скачы да поспеху

Паважны скандынаўскі народ — а менавіта датчане — у зімовыя святы імкнецца пазбавіцца ад усяго старога і дакучлівага і як след павесяліцца. Першай пад гарачую дацкую руку трапляецца посуд, які не выкарыстоўваецца, — яго беражліва захоўваюць увесь год, каб бязлітасна разбіць у навагоднюю ноч «на шчасце», прычым абавязкова каля парога сяброў або блізкіх. Таксама пад бой курантаў у Даніі прынята падскочыць як мага вышэй, каб «даскочыць» да поспеху ў надыходзячым годзе.

Віно і шампанскае

У Францыі Калядам заўсёды папярэднічае Reveillon (што літаральна азначае «напярэдадні чаго-небудзь»). У гэты вечар людзі збіраюцца разам з сям'ёй і сябрамі, атрымліваючы асалоду ад раскошнай вячэры, абавязкова з віном і шампанскім. Усе прыбіраюцца (нават калі вячэра праходзіць дома), на стол ставяць найлепшы фарфор, дастаюць срэбны посуд і запальваюць свечкі — французы ведаюць толк у прыгажосці! На поўдні Францыі, у Правансе, ёсць звычай падаваць 13 дэсертаў, па ліку 12 апосталаў і самога Ісуса Хрыста.

Круглае — гэта добра

Сімвалам росквіту, на думку філіпінцаў, з'яўляюцца любыя круглыя рэчы і абрысы, таму сукенка ў гарох тут будзе лічыцца ідэальным навагоднім туалетам. Таксама тут імкнуцца набіць кішэні круглымі манеткамі, а стол запоўніць ідэальна круглявай садавіной. Лічыцца, што чым больш грошай ёсць у чалавека ў навагоднюю ноч, тым больш іх будзе і на працягу ўсяго года.

Таксама напярэдадні новага года філіпінскія дамы свецяцца не горш за ёлкі — уключаючы святло ва ўсіх памяшканнях, тут такім чынам адпужваюць злых духаў. Таксама прынята насцеж адчыніць усе дзверы і вокны напярэдадні поўначы, каб з яе надыходам хуценька ўсё зачыніць, выпускаючы год, які сыходзіць, і вітаючы новы.

Тут пачынаецца Новы год

Фінляндыя, вядома, проста створана для таго, каб святкаваць Новы год. Менавіта тут знаходзіцца Лапландыя — радзіма Ёўлупукі, фінскага Санта-Клаўса, які адсюль пачынае сваё падарожжа па ўсім свеце ў аленевай запрэжцы. А напярэдадні свята на поўдні краіны штогод праходзіць урачыстая цырымонія абвяшчэння Дэкларацыі каляднага міру. Гэтая традыцыя — амаль такая ж старажытная, як і сам Ёўлупукі: упершыню дэкларацыя была створана ў XIII стагоддзі. У ёй традыцыйна гаворыцца пра тое, што любая праява непрыстойных паводзін, якія могуць перашкодзіць святу, будзе карацца па ўсёй строгасці закону. Іншымі словамі, хуліганства падчас фінскіх Каляд вельмі не вітаецца. Любімыя калядныя пачастункі фінаў — вяндліна, вэнджаная і салёная рыба, сыр і салодкія пірагі. А на поўначы краіны на стале абавязкова будуць стравы з... аленіны. Вось такое навагоднае «святатацтва».

Фіны, як вядома, славяцца сваімі знакамітымі саўнамі і вылучаюць ім нямала месца ў сваім побыце — у большасці сем'яў тут ёсць свае ўласныя лазенкі, дзе, паводле легенды, жывуць эльфы, якія аберагаюць дамачадцаў. Не дзіўна, што менавіта тут фіны пачынаюць калядны вечар. Удосталь папарыўшыся, яны прысвячаюць свой час іншаму немалаважнаму рытуалу — адпраўляюцца на могілкі, бо праведваць памерлых блізкіх тут прынята менавіта пасля заходу на Каляды. Ёсць у жыхароў Фінляндыі і свая калядная варажба — у ваду апускаецца расплаўлены метал, каб паглядзець, якую ён прыме форму.

Паямо!

Фіны, дарэчы, не адзіныя, хто ўсур'ёз «парыцца» на тэму калядных забаў. Эстонцы таксама з задавальненнем праводзяць вечар гэтага свята ў саўне — лічыцца, што гэта найлепшы спосаб змыць з сябе ўсю бязладзіцу мінулага года і ўвайсці ў новы цалкам ачышчаным. Акрамя таго, тут таксама жывуць прыхільнікі знаёмай нам навагодняй традыцыі — наесціся да адвалу. Лічыцца, што паесці ў навагоднюю ноч сем, дзевяць ці дванаццаць разоў (пакінуўшы пры гэтым апошнія крошкі добразычлівым духам) — верны спосаб забяспечыць сабе ў новым годзе багацце і дастатак.

З продкамі

Сёе-тое агульнае з фінамі ёсць і ў чылійцаў: яны таксама адпраўляюцца на могілкі ў святочную ноч. Жыхары чылійскага горада Талька ўжо больш за 20 гадоў пачынаюць святкаванне Новага года ўрачыстым шэсцем на чале з мясцовым мэрам на гарадскія могілкі. Таксама чылійцы вераць, што перад Новым годам, неабходна прагнаць з дому ўсю негатыўную энергію, і дапамагае ім у гэтым звычайны венік, якім усё лішняе вымятаюць на вуліцу. А каб, наадварот, прыцягнуць да сябе ўсё самае добрае, рэкамендуецца з'есці па лыжцы сачавіцы за кожны ўдар курантаў (што даволі няпроста).

Грайце гучней

Венгры з прыходам Новага года пачынаюць з усіх сіл дзьмуць у разнастайныя ражкі, свісткі і дудачкі, адганяючы такім чынам ад сваіх дамоў злых духаў і ўсякую нечысць. Акрамя таго, традыцыйныя венгерскія дудачкі прыцягваюць у жыллё людзей дабрабыт, радасць. Скончыўшы свістаць, усе ідуць пакаштаваць святочныя стравы: фасолю і гарох, якія даюць людзям сілу духу і здароўе, яблыкі, якія дораць прыгажосць, і арэхі, якія абараняюць ад бед. Дарэчы, у Венгрыі існуе павер'е, што калі ў навагоднюю ноч наесціся часнаку, то ў будучым годзе ўсе хваробы абыдуць цябе бокам. Галоўнае, каб разам з хваробамі, спалохаўшыся паху, ад «ужывальніка» не збеглі і сябры.

Пярсцёнак на шчасце

Брытанцы таксама не выпускаюць выпадку злавіць поспех за хвост і з задавальненнем выконваюць свае старыя як свет навагоднія традыцыі. Напрыклад, традыцыйным святочным ласункам тут лічыцца пудынг, а падчас яго гатавання кожны член сям'і можа памяшаць масу па гадзіннікавай стрэлцы, загадваючы жаданне. Таксама менавіта ў пудынг раней запякалі манетку або пярсцёнак, які прыносіць поспех або шчаслівае замужжа таму, хто яго знойдзе.

Камяні ад гасцей

У Грэцыі існуе Дзень святога Васіля. 14 студзеня дзеці пакідаюць каля каміна свой абутак, спадзеючыся, што святы пакладзе ў яго падарункі. Дарослыя, адпраўляючыся адно да аднаго ў госці, бяруць з сабой вялікія камяні, каб пакласці іх каля парогаў гасцінных дамоў. Такім чынам прынята праяўляць пажаданне багацця і дабрабыту гаспадарам.

Героі з масла

У Тыбеце на будыйскі Новы год — 30 студзеня — манахі лепяць складаныя скульптуры са сметанковага масла. Гэтыя мудрагелістыя статуі ўяўляюць сабой герояў старажытных міфаў і могуць дасягаць 15 метраў у вышыню. Каб дзіўныя стварэнні доўга захоўваліся ў першапачатковым выглядзе, выклікаючы захапленне наведвальнікаў будыйскіх манастыроў, іх захоўваюць у прахалодным месцы і асвятляюць адмысловымі алейнымі лямпамі. У іх мяккім святле здаецца, нібыта міфічныя гіганты ажываюць. Бо ў навагоднюю ноч магчыма ўсё — асабліва ў Тыбеце!

Іван КУПАРВАС.